

ШТО МОЖНА ПАДЧАС РАМОНТУ **5**



СПАДЧЫНА АРХІТЭКТАРА ШАБУНЕЎСКАГА **6**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛІПЕНЯ 2018 г.
АЎТОРАК
№ 129 (28745)

# У ТРАДЫЦЫЯХ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## Чым запомніўся рэспубліканскі фестываль «Купалле-2018» у Александрыі



Фота БелТА.

**У святочны графік Купалля свае карэктывы ўнеслі дождж і... працоўная субота. Але аматарам адпачыць на прыродзе гэта не перашкодзіла. Асабліва шматлюдна было ў суботу вечарам, калі адбыўся гала-канцэрт і феерверк. Народ ехаў з дзецьмі, шмат хто цэлымі сем'ямі. Па папярэдніх звестках, свята ў Александрыі наведала 85 тысяч гасцей.**

### Сувязь з роднай зямлёй

Галоўны святочны гала-канцэрт «Малая радзіма» прыйшлося адкласці амаль на гадзіну. За 10 хвілін да яго пачатку пачаўся моцны дождж з навальніцай, а глядзельная зала, як вядома, знаходзіцца пад адкрытым небам. Як толькі надвор'е супакоілася, гледачы занялі свае месцы. Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, які традыцыйна адкрывае купальскае дзейства, прызнаўся, што Купалле для яго асаблівае свята.

— Менавіта ў гэты дзень, у гэтую ноч мы асабліва адчуваем сакральную сувязь з роднай зямлёй, продкамі і адно з адным. Таму так хочацца вырвацца з гарадскога жыцця і стаць бліжэй да прыроды — яе прыгажосці і жыватворнай сілы, набрацца добрай энергіі сонца, дажджу, удыхнуць водары травы і лесу, атрымаць асалоду ад прахалоды рэк і азёр, — адзначыў кіраўнік Беларусі.

— З вялікім хваляваннем, пачуццём радасці і гордасці я прыязджаю на сваю малую радзіму, — падзяліўся настроем з гледачамі Аляксандр Лукашэнка перад тым, як заняць сваё месца ў глядзельнай зале. — Для мяне гэты край заўсёды будзе асаблівы. Але такі ж важны і дарагі сэрцу, як любы іншы куток маёй Беларусі — дзівоснай, прыгожай, з добрым, працавітым, гасцінным і цярплівым народам. І як бы ні склаўся наш лёс, куды б нас ні закінула, нам жыццёва неабходна вяртацца да вытокаў. Туды, дзе пейзажы ажываюць сюжэтамі з дзяцінства і юнацтва, дзе глыбока пушчаныя карані радавога дрэва. Хай нават і ў думках, але мы павінны трымацца за гэты маленькі свет, адкуль пачаўся наш шлях у вялікае жыццё. Гэты свет і ёсць наша папараць-кветка. У ім і знаходзім мы сваю сілу, апору і шчасце. Ён наш абярэг.

З вялікай фестывальнай сцэны сваё мастацтва дарылі вядомыя выканаўцы і калектывы — салісты ансамбля «Сіняя птушка», Іван Вабішчэвіч, Сяргей Трафімаў, Алена Ланская, Вікторыя Коха, эксцэнтрычны гурт «Лісапетны батальён», іншыя айчынныя, расійскія і ўкраінскія артысты. У аснову сюжэта лягла гісторыя эстраднай суперзоркі, які па волі выпадку аказаўся на сваёй малой радзіме — у невялікай беларускай вёсцы. Тут ён сустрэў людзей, якія былі дарагія яму ў дзяцінстве. Купальскае відовішча адначасова транслiравалася на некалькіх святлодыёдных экранах. Падчас прадстаўлення сын Прэзідэнта Мікалай Лукашэнка сыграў на фартэпіяна «Вяртанне да спадчыны» — твор беларускага кампазітара Валерыя Іванова. Завяршыўся канцэрт святочным феерверкам. Частка моладзі засталася на дыскатэку, а хто хацеў паехаць дадому скарысталіся чыгуначным транспартам. Рух цягнікоў мясцовых рэгіянальных ліній быў скарэктаваны з улікам затрымкі канцэрта.

### Можна было купіць нават трактар

Упершыню на фестывалі была арганізаваная выстаўка беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі. І малыя, і дарослыя з задавальненнем фатаграфаваліся на фоне бліскучых з беларускім арнаментам трактароў і агрэгатаў.

Выставачны рад пачынаўся з зусім маленькіх «экспанатаў».

— Гэта наша міні-тэхніка, а 112-ы трактар — адна з навінак прадпрыемства — ён больш дасканалы, у ім устаноўлена гідрааб'ёмнае рулявое кіраванне, колы вышэйшыя і ёсць яшчэ шмат іншых прыемных якасцяў. Падыходзіць для работы на градках ад 5—10 сотак да 2—3 гектараў. Шматфункцыянальны, можа выкарыстоўвацца як камунальны транспарт, — рэкламаваў прадукцыю Смаргонскага агрэгатнага завода яго супрацоўнік Павел Шульжыцкі.



Фота БелТА.



А вось трактар Беларус 320.4 Бабруйскага завода дэталяў і трактарных агрэгатаў, напэўна, ёсць у кожным калгасе.

— Іх выпушчана больш за 10 тысяч, самая ходавая мадэль, актыўна выкарыстоўваецца на фермах, — удакладніў прадстаўнік прадпрыемства. — Непасрэдна ў ААТ «Александрыйскае» працуе каля 20 нашых трактароў. Мы 9 гадоў на рынку, і нас добра ведаюць у Беларусі і за яе межамі. Каля 50—60 % нашай тэхнікі ідзе на Расію, 30 % — застаецца ў Беларусі, астатнія 10 % адпраўляюцца ў краіны блізкага і далёкага замежжа. Адна з нашых нядаўніх навінак у канцы чэрвеня адправілася на Мадагаскар. Пастаўляем трактары і ў Паўднёвую Амерыку.

### Відовішчы і хлеб...

Наогул знайсці ў гандлёвых радах можна было ўсё, што заўгодна. Нават саджанцы нейкага экзатычнага дрэва, дзе адначасова растуць і лімон, і мандарын, і апельсін. Адна з гандлярак паведаміла, што прывезла экзотыку з Падмаскоўя. Маўляў, праз паўгода саджанец заквітнее, а яшчэ праз паўгода можна будзе збіраць ураджай. Але народ толькі недаверліва прыглядаўся.

Адных толькі аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання мелася на Купаллі ў Александрыі болей за 130. Працягласць гандлёвых радоў складала каля кіламетра. Шашлыкі, квас, прахаладжальныя напоі, кандытарскія вырабы — усё гэта было запатрабавана. Акрамя гэтага можна было прадэгуставаць літоўскія і ўкраінскія стравы. Гандлёвыя пункты ад гэтых краін таксама працавалі на фестывалі.

Мядовых спраў майстры Аляксей і Галіна Ермаковы з вёскі Ржаўка Слаўгарадскага раёна прадстаўлялі сваю сядзібу, дзе з 2017 года працуе музей «Пчалінае царства». У якасці эксклюзіўнага лекавага сродку сужэнцы прапаноўвалі пропалiснае палатно.

— Шмат хто не ведае пра гэты цудадзейны сродак наогул нічога, — дзялілася сакрэтам Галіна. — Пчолы вельмі не любяць скразнякоў, і мы накрываем рамкі палатном, а насякомыя заладжваюць у ім усе да адной дзірачкі пропалісам. Пры прастудзе награваеш гэты ліст над парай і прыкладваеш да грудзей. Атрымліваецца эфект гарчычніка.

СТАР. 3

■ Самыя

**Мёрскі раён: самы экалагічна чысты**

# «ГЭТА — ВАША ЗЯМЛЯ, І НЯМА ЛЕПШАЙ ЗА ЯЕ»



**У сярэдзіне верасня ў Мёры прыязджае каля дзвюх тысяч гасцей — на фестываль «Жураўлі і журавіны». Мінчане ўстаюць а пятай раніцы, каб паспець наведаць сялянскія падворкі з непаўторнымі мясцовымі стравамі, і, вядома, каб купіць журавін — яны тут і ў гэты дзень самыя танныя ў краіне. Але найбольш дзіўнае — гэта шэрыя журавы. Іх на мясцовых балотах у верасні збіраецца больш за чатыры тысячы, а яшчэ — дзясяткі тысяч гусей розных відаў. Птушкі сілкуюцца некалькі тыдняў, каб потым ляцець у вырай. Апошні вялікі прыпынак перад доўгай і небяспечнай дарогай. Госці фестывалю маюць магчымасць убачыць гэты птушыны цуд. І тыя, хто прыязджае сюды ўпершыню, абавязкова потым плануюць наступныя паездкі. Бо гэта сапраўды найпрыгажэйшая і незвычайная мясціна нашай краіны. Пра тое, што акрамя ўнікальнай прыроды мае раён, — наша размова са старшынёй Мёрскага райвыканкама Ігарам КУЗНЯЦОВЫМ.**

СТАР. 5

■ Адкрытая эканоміка

# ІНДУСТРЫЯ ПАСЛУГ ПА-БЕЛАРУСКУ

## Як прадаць на замежны рынак тое, што нельга адчуць навобмацак?

**Геаграфічная дыверсіфікацыя і развіццё рынку паслуг — сёння асноўныя задачы для айчыннага экспарту. Актыўных дзеянняў у гэтым напрамку нядаўна на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна патрабаваў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, адзначыўшы істотны патэнцыял гандлю паслугамі. Нацыянальная праграма падтрымкі і развіцця экспарту Беларусі на пяцігодку ўстанавіла, што ў 2018-м паслугі ў агульным аб'ёме павінны скласці не менш за 23 % (у 2017 годзе — 21,4 %). Як беларускаму рынку паслуг разварнуцца на поўную моц, каб з рангу тых, хто падае надзеі, выйсці ў шэраг лідараў экспартных пазіцый?**

### Паслуга за паслугу

У экспарце паслуг у параўнанні з гандлем таварамі ёсць шэраг пераваг. Па-першае, не ўдзяляецца ўвага транспартным выдаткам (ці яны ўвогуле адсутнічаюць). Па-другое, паслугі патрабуюць менш знешняга фінансавання. «Экспарт паслуг з'яўляецца менш уразлівым да знешніх шокаў. Калі ў ЗША ў 2009 годзе быў крызіс, экспарт і імпарт тавараў прасеў на 30 %, а паслуг — нават на 7 % не знізіўся. Адзначу, што паслугі менш эластычныя да знешняга попыту. Калі раптам у свеце попыт знізіцца, ВУП у краіне-партнёру ўпадзе, то экспарт тавараў значна паменшыцца ў параўнанні з паслугамі. Да таго ж экспарт паслуг расце больш дынамічна, чым экспарт тавараў. Са стратэгічнага пункту погляду спецыялізавацца на паслугах выгадна», — кажа **Юлія ВАШКЕВІЧ, выкладчык кафедры сусветнай эканомікі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.**



Разумеюць і адчуваюць на ўласных даходах гэтую выгаду і прадпрыемствы. Па прамежкавых выніках (студзень — красавік) гэтага года экспарт паслуг склаў больш за $2,6 мільярда, пры тым сальда — $1,1 мільярда. Лічбы перавышаюць аб'ёмы такога ж перыяду ў 2017-м. Тады экспарт спыніўся на $2,2 мільярда пры сальда ў $934 мільёны. У лідарах ужо шмат год «класічная» тройка галін — транспарт, будаўніцтва і камп'ютарныя паслугі.

«Лічба 23 % для экспарту паслуг, якую агучылі на пасяджэнні Саўміна ў красавіку, адлюстроўвае сярэднюю структуру сусветных суадносін гандлю таварамі і паслугамі — 20 % да 80 %. Гэта рэальная лічба для нашай эканомікі. Магчыма, яна здаецца незвычайнай, таму што ў структуры нашага ВУП паслугі займаюць прыкладна 50 %. На фоне іншых краін гэта не вельмі многа. Напрыклад, у Еўрапейскім саюзе паслугі складаюць 2/3 ВУП», — падкрэслівае Юлія Вашкевіч.

### На шляху з «варагаў у грэкі»

З-за свайго геапалітычнага становішча Беларусь адчувае на сабе значны ўплыў розных эканамічных, палітычных і ваенна-стратэгічных фактараў. Разам з тым геаграфічнае размяшчэнне на перасячэнні транспартных камунікацый дапамагае выгадна яго выкарыстоўваць для эканамічнага развіцця.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### САМІТ ЕС — ЯПОНІЯ ПЕРАНЕСЛІ З-ЗА ЛІЎНЯЎ

Саміт Еўрасаюза і Японіі, які мусіў адбыцца 11 ліпеня ў Бруселі, перанесены на 17 ліпеня ў Токіа ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі і маштабнымі разбурэннямі, выкліканымі паводкай і апоўзнямі ў заходніх раёнах краіны. Пра гэта паведаміў афіцыйны прадстаўнік Еўракамісіі Маргарыціс Схінас.

Раней у панядзелак стала вядома, што прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ адклаў паездку ў краіны Еўропы і Афрыкі, якая была запланавана на гэты тыдзень, з-за складанай сітуацыі з ліўнямі ў краіне. Пра гэта абвясціў сам кіраўнік японскага ўрада, адзначыўшы, што адмяняе паездку за мяжу, «каб накіраваць усе намаганні на барацьбу са стыхійным бедствам».

Па апошніх звестках, ахвярамі ліўневых дажджоў і апоўзняў на захадзе Японіі сталі прынамсі 105 чалавек, яшчэ каля 80 лічацца зніклымі без вестак.

### МАРЫН ЛЕ ПЕН ЗАЯВІЛА, ШТО ЯЕ ПАРТЫЯ Ў ЖНІЎНІ МОЖА ЗАКРЫЦЦА З-ЗА АРЫШТУ СРОДКАЎ

Французская апазіцыйная партыя «Нацыянальнае аб'яднанне» (былы «Нацыянальны фронт») ужо ў жніўні сёлета можа спыніць сваё існаванне з-за рашэння французскага суда накласці арышт на дзяржсубсідыі, якія выдзяляюцца на партыйную работу. Пра гэта заявіла ў панядзелак лідар «Нацаб'яднання» Марын Ле Пен. Як паведаміла Agence France-Presse, на такі крок французская юстыцыя пайшла ў сувязі з тым, што раней Суд Еўрасаюза прызнаў лідара партыі Марын Ле Пен вінаватай у растраце сродкаў Еўрапарламента на фіктыўнае працаўладкаванне яе памочнікаў і абавязаў яе вярнуць Еўрапарламенту €320 тысяч. Гадавая дзяржсубсідыя «Нацыянальнаму аб'яднанню» складае €2,5 млн.

ISSN 1990 - 763X

### У ІТАЛІІ ПАМЕРЛА НАЙСТАРЭЙШАЯ ЖЫХАРКА ЕЎРОПЫ

У Італіі памерла 116-гадовая Джузепіна Праета-Фраў. Яна была самай доўгажывучай верыфікаванай жанчынай не толькі ў сваёй краіне, але і ў Еўропе, а таксама другой самай пажылой жанчынай на планеце пасля 117-гадовай японкі Ціё Міяке, перадае італьянскае інфармацыйнае агенцтва ANSA. Па звестках СМІ, Праета-Фраў памерла 6 ліпеня. Ёй было 116 гадоў і 37 дзён. Апошнім часам жанчына пражывала ў сваім доме ў камуне Мантэлупа-Фіярэнціна ў правінцыі Фларэнцыя. Інфармацыю пра смерць доўгажыхаркі пацвердзіў мэр камуны Паола Масеці. Ён таксама выклаў фатаграфію з доўгажыхаркай у сваім Facebook, напісаўшы пра яе радкі цёплых слоў.

Агенцтва ANSA таксама прыводзіць некалькі фактаў з біяграфіі памерлай. Паводле яго даных, яна нарадзілася 30 мая 1902 года ў горадзе Ла-Мадалена на італьянскім востраве Сардзінія. У 60-х гадах жанчына разам з сям'ёй пераехала ў Фларэнцыю.

### ПРЭЗІДЭНТ ФІЛІПІН ПААБЯЦАЎ ПАДАЦЬ У АДСТАЎКУ, КАЛІ ЯМУ ДАКАЖУЦЬ, ШТО БОГ ЁСЦЬ



Радрыга Дутэртэ абвясціў, што неадкладна падасць у адстаўку, калі хто-небудзь зможа даказаць яму існаванне Бога. У якасці доказу Дутэртэ прымае фатаграфіі і сэлфі, а таксама іншыя сведчанні тых, хто размаўляў з Богам альбо пабываў у раі, паведамляе CNN.

Прамова 73-гадовага палітыка накіравана перш за ўсё супраць каталіцкай царквы (Філіпіны — пераважна каталіцкая краіна), з якой у яго ўзніклі рознагалоссі. 24 чэрвеня ён назваў хрысціянскага Бога «дурным», а затым адмовіўся прасіць прабачэння за свае словы. Дутэртэ падкрэслівае, што верыць у «звышбога», які падтрымлівае парадак у космасе.

Дутэртэ стаў прэзідэнтам Філіпін у 2016 годзе. Вядомы тым, што пры ім пачаліся масавыя забойствы наркадылераў, а сам ён рэзка выказваўся ў дачыненні да розных палітыкаў.

## КОРАТКА

- **У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» адкрылі будаўнічы гарадок для падрадных арганізацый.**



Фота БелТА.

- Час выпуску тавараў на Мінскай рэгіянальнай мытні ў студзені — маі скараціўся ў сярэднім у 2,4 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.
- **Сезон ружэйнага палявання на бакаса з паляўнічымі сабакамі — выжламі, спаніэлямі, рэтрыверамі — адкрываецца ў Беларусі з 14 ліпеня.**
- Самае працяглае ў XXI стагоддзі зацьменне Месяца адбудзецца 27 ліпеня. Поўнае зацьменне прадоўжыцца гадзіну і 43 хвіліны. Частковае зацьменне будзе праходзіць 3 гадзіны 55 хвілін.

■ Абітурыент-2018

# Што рабіць, калі сапсаваў сертыфікат?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**10 ліпеня ў пунктах правядзення ЦТ распачнецца выдача сертыфікатаў. Для атрымання сертыфіката абітурыент павінен звяртацца ў тую навучальную ўстанову, на базе якой ён здаваў дысцыпліны ЦТ. Згодна з Палажэннем аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, абітурыент атрымлівае сертыфікат асабіста пры прад'яўленні арыгінала пашпарта і пропуска з адзнакай «Тэсціраванне прайшоў». Сертыфікат выдаецца абітурыенту пад роспіс, а пропуск у яго забіраюць.**

У выпадку немагчымасці атрымаць з уважлівай прычыны сертыфікат асабіста, гэта можа зрабіць законны прадстаўнік непаўналетняга абітурыента (хтосьці з яго бацькоў або апекуноў) пры прад'яўленні:

1) арыгінала пашпарта законнага прадстаўніка,

2) дакумента, які пацвярджае статус законнага прадстаўніка (пасведчанне аб нараджэнні),

3) копіі пашпарта абітурыента, завеpанай натарыяльна.

Таксама сертыфікаты можа забраць прадстаўнік абітурыента пры прад'яўленні:

1) арыгінала свайго пашпарта,

2) даверанасці, засведчанай натарыяльна або ўпаўнаважанай асобай,

3) копіі пашпарта абітурыента, завеpанай натарыяльна.

Паколькі сертыфікат — вельмі важны афіцыйны дакумент, правяраць дакладнасць яго афармлення, у прыватнасці, напісанне прозвішча, імя і імя па бацьку, трэба неадкладна, інакш праблемы абавязкова ўзнікнуць ужо пры падачы дакументаў у прыёмную камісію. У тым выпадку, калі абітурыент сапсаваў або страціў сертыфікат, яго могуць замяніць. Для гэтага трэба звяртацца ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Але дублікат выдаецца на працягу пяці дзён з моманту падачы адпаведнай заявы.

У выпадку замены дакумента, які сведчыць асобу, у перыяд паміж датай рэгістрацыі ў якасці абітурыента і датай выдачы сертыфіката апошні афармляецца ў адпаведнасці з данымі новага дакумента, які сведчыць асобу.

Тыя, хто здаваў тэсты ў рэзервовыя дні, змогуць атрымаць сертыфікаты толькі ў БДУ з 13 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Парламенцкі дзённік

# ПЕРАДАВІКІ «ЛІЧБЫ»

## Беларусь — за ўмацаванне ўзаемадзеяння ў лічбавай эканоміцы на Еўразійскім кантыненце

**Такую пазіцыю агучыў кіраўнік беларускай парламенцкай дэлегацыі, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК у сваім выступленні на пасяджэнні агульнага камітэта ПА АБСЕ па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі, перадае прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. Нагадаем, гэта адбылося ў рамках 27-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Берліне.**

Кіраўнік беларускай парламенцкай дэлегацыі нагадаў і аб ініцыяваным нашымі парламентарыямі праекце рэзалюцыі «Прасоўванне лічбавай эканомікі ў інтарэсах забеспячэння эканамічнага росту на прасторы АБСЕ», які адлюстроўвае пытанні пераходу і адаптацыі грамадства да лічбавай эканомікі, гарманізацыі стандартаў і міжнароднага супрацоўніцтва ў мэтах збліжэння дзяржаў і лічбавізацыі міжнароднага гандлю.

Ён акцэнтаваў увагу на неабходнасці садзейнічання эканамічнаму прагрэсу ў рэгіёне АБСЕ праз развіццё чалавечага капіталу, прасоўванне мадэляў належнага кіравання, барацьбу з карупцыяй і адмываннем грошай, праз інавацыі і развіццё лічбавай эканомікі.

На думку Баляслава Пірштука, узаемадзеянне ў сферы лічбавай эканомікі як паміж краінамі, так і розвымі інтэграцыйнымі структурамі на Еўразійскім кантыненце будзе садзейнічаць умацаванню пачуцця ўзаемазвязанасці эканамічнай прасторы на кантыненце і ўзаемазалежнасці кожнага з яе складнікаў.



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый Варанецкі** прыняў удзел у пасяджэнні агульнага камітэта па палітычных пытаннях і бяспецы.

Ён пацвердзіў гатоўнасць Беларусі і ў далейшым актыўна працаваць у рамках АБСЕ па супрацьдзеянні транснацыянальным выклікам і пагрозам. На яго думку, эфектыўна супрацьстаяць тэрарызму можна комплексным падыходам, накіраваным на выяўленне першапрычын, а таксама ўлічваючы развіццё новых тэхналогій.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Блізкая ўлада

# Колькасць зваротаў на прамыя лініі за паўгода знізілася на 30 %

**Капітальны рамонт, якасць вады, заработная плата... Жыхары Гродзенскай вобласці чарговы раз мелі магчымасць напрамую звярнуцца да старшыні аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА падчас прамой тэлефоннай лініі.**



Фота БелТА.

Як паведаміў ён, палова зваротаў датычылася работы ЖКГ. Гэтыя пытанні пастунова здымаюцца. У прыватнасці, вядзецца растлумачальная работа, напачатку года публікуецца праграма па капітальным рамонце дамоў. Некаторыя пытанні вырашаюцца, што называецца «ў ручным рэжыме». Напрыклад, па званку на прамую лінію аб працечцы водаправода, была накіравана аварыйная брыгада. Жыхарка абласнога цэнтра пацікавілася, ці будзе зроблена ўцяпленне тарцовых сцен дома па вуліцы Кляцкова, 44. Як патлумачыў **галоўны інжынер Гродзенскай гарадской ЖКГ Андрэй КАХНОВІЧ**, такая работа будзе праведзена, але для гэтага патрабуецца дапрацоўка праекта. Жанчыне растлумачылі, што зараз вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі на ўцяпленне сцен. Будуць праведзены і іншыя работы — рамонт даху, уваходнай групы, вентыляцыі, ліфта, замена водасцёка.

Пастунова здымаюцца і шматлікія пытанні па якасці вады. У вобласці распрацавана праграма, згодна з якой вядзецца будаўніцтва ачышчальных збудаванняў, станцый абезжалезвання і іншых аб'ектаў. Такая ж сітуацыя датычыцца і мясцовых дарог. Адпаведная праграма разлічана на 2018—2020 гады, інфармацыя аб ходзе работ і ўчастках рамонту публікуецца ў СМІ.

Аналіз паказвае, што колькасць зваротаў у абласныя структуры зніжаецца. Многія пытанні жыхары вырашаюць на месцах, у райвыканкамах. Прамыя лініі — гэта інструмент, які дае добры эфект, адзначыў Уладзімір Краўцоў. Такая сувязь працуе не адзін год і дазваляе ўладам трымаць руку на пульсе часу. Аналіз паквартальных зваротаў паказвае, дзе ёсць напружанасць, а дзе яна знята. Напрыклад, за першыя паўгода колькасць зваротаў у абласны выканаўчы камітэт знізілася на 30 %. Такая ж тэндэнцыя назіраецца і ў некаторых раёнах вобласці. Разам з тым не заўсёды на месцах пэўным чынам рэагуюць на звароты альбо жыхары жадаюць атрымаць адказ у вышэйшай інстанцыі. Так, жыхар Слоніма патэлефанаваў, каб паведаміць аб сітуацыі па выплаце зарплаты. Па яго словах, прадпрыемства ліквідавана, але работнікі не атрымалі канчатковы разлік. Уладзімір Краўцоў даў даручэнне раённым уладам дэтальна разабрацца ў сітуацыі і ўрэгуляваць гэтае пытанне.

— Узнікае сітуацыя, калі прадпрыемства пападае ў катэгорыю банкрутаў, узнікае праблема разлікаў з людзьмі, і званок са Слоніма — прыклад такой сітуацыі. Улады павінны ўрэгулёўваць такія спрэчкі.

Важна, каб прадпрыемствы своечасова разлічваліся з людзьмі, выплачвалі зарплату, — падкрэсліў губернатар, — раней паступала шмат пытанняў па працаўладкаванні, цяпер градус напружанасці знізіўся. На сённяшні дзень на аднаго беспрацоўнага ёсць тры вакансіі. Задача ўлады — каб было больш прапаноў па тых спецыяльнасцях, якія запатрабаваны на рынку працы. Мы працягваем дзейнасць у гэтым кірунку. Ствараюцца новыя працоўныя месцы, аказваецца дапамога ў падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў.

Па словах Уладзіміра Краўцова, усё часцей з'яўляюцца звароты, калі людзі прапануюць свае ідэі і шукаюць з боку ўлады партнёраў. Ёсць прапановы па дабраўпарадкаванні тэрыторый і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Нямала такіх прыкладаў у Навагрудскім раёне, дзе грамадскі фонд накіраваны на ўзнаўленне старажытнай сядзібы знакамітага роду Храбтовічаў, а прадпрымальнік вядзе работы па захаванні Любчанскага замка. Улады заўсёды ідуць насустрач такім зацікаўленым грамадзянам, падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■ Надвор'е

# Прыгрэе, але лакальна... дажджы

## У сераду — чацвер тэмпература павысіцца да плюс 30

**Чакаецца цёплае надвор'е, калі ў першай палове тыдня дажджоў будзе няшмат, і яны будуць насіць лакальны характар. А ў другой палове тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальных падзелаў, і дажджоў будзе больш, а тэмпературны фон да канца працоўнага тыдня крыху панізіцца, перадае Белгідрамет.**

У ноч на сераду таксама чакаецца пераважна без ападкаў. А вось удзень у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 10 да плюс 17 градусаў, днём паветра прагрэецца да 24—29 цяпла. Надвор'е пачне змяняцца 12 ліпеня. Менавіта ў чацвер пад уплывам атмасфернага фронту, які змяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы, уначы ў асобных раёнах, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, удзень — 23—30 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пятніцу атмасферны фронт пачне рухацца на паўночны ўсход, абумовіць на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы, у асобных раёнах чакаюцца навальніцы і моцныя дажджы. Уначы будзе нават занадта цёпла — ад плюс 13 да плюс 19 градусаў, максімальная тэмпература ўдзень у асноўным у межах 19—26 градусаў, па паўднёвым усходзе месцамі паветра прагрэецца да плюс 28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Глушкавічы просяць запраўку

**На сваёй малой радзіме — у аграгарадку Глушкавічы Лельчыцкага раёна — сустрэўся з землякамі старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь Андрэй Швед.**

На асабісты прыём да яго звярнуліся людзі, не згодныя з прысудам суда, а таксама грамадзянка, якая аспрэчвае судова-медыцынскую экспертызу памерлага ад пераахаладжвання сваяка. Жанчына перакананa, што смерць насіла гвалтоўны характар, аднак экспертыза не знайшла гэтаму пацвярджэнняў. Старшыня паабяцаў пераправерыць высновы экспертызы і даць пісьмовы адказ, а таксама растлумачыў парадак абскарджання судовых рашэнняў.

Шчэбневы завод «Глушкавічы», дзе працуе ледзь не большасць насельніцтва, стаў месцам сустрэчы з людзьмі, многія з якіх памятаюць бацькоў Андрэя Іванавіча. Менавіта таму землякі задавалі самыя вострыя пытанні, многія з якіх не адносяцца да яго непасрэднай кампетэнцыі, але вельмі важныя для людзей. Напрыклад, сельскія жыхары папрасілі дапамагчы з будаўніцтвам аўтазапраўкі, бо самая блізкая знаходзіцца аж за 50 км — у райцэнтры. Другім важным грамадскім пытаннем стала будаўніцтва станцыі абезжалезвання вады. Людзей таксама цікавіла добраўпарадкаванне дарог: насельніцтва аграгарадка перавышае дзве тысячы, шмат аўтатранспарту, а на вуліцах няма ходнікаў. Андрэй Швед паабяцаў паспрыяць у рашэнні пытанняў і пракантраляваць ход іх выканання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ІНДУСТРЫЯ ПАСЛУГ ПА-БЕЛАРУСКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўнымі паслугамі, якія фарміруюць паказчык экспарту, з'яўляюцца перавозка грузаў і пасажыраў, плата за праезд па дарогах, фрахтаванне транспартных сродкаў, іх тэхнічнае абслугоўванне, рамонт, складская і транспартна-лагістычная дзейнасць.

Як паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый, у 2017-м экспарт транспартных паслуг прынёс даход у памеры $3,5 мільярда ЗША. Сёлета чакаецца прырост дзякуючы развіццю грамадзянскай авіяцыі, нарошчванню чыгуначных і аўтамабільных грузавых перавозак і транспартна-экспедыцыйнага абслугоўвання.

Беларусь ва ўсе часы была важным транзітным кірункам. Але сёння шлях з «варагаў у грэкі» ўжо не такі шматабяцальны. Лагістыка гандлю зрабіла значны ўхіл на Усход. Беларусь цяпер з'яўляецца пунктам, які звязвае не толькі Балтыйскае і Чорнае моры, але і Еўрапейскі саюз з Кітаем.

За пяць месяцаў 2018 года ў чыгуначных зносінах Кітай — ЕС — Кітай транзітам па тэрыторыі Беларусі перавезена 108,5 тысячы кантэйнераў у дваццаціфутавым эквіваленце (умоўная адзінка вымярэння ўмяшчальнасці грузавых транспартных сродкаў, роўная аб'ёму стандартнага металічнага кантэйнера даўжынёй 6,1 м, шырынёй 2,4 м і вышынёй 2,6 м). Гэта на 23 % больш за ўзровень аналагічнага перыяду 2017 года.

Новыя магчымасці для транспартнай сістэмы нашай краіны адкрывае праект «Адзін пояс — адзін шлях». Урады Беларусі і Кітая падпісалі пагадненне аб развіцці міжнародных грузавых перавозак і супрацоўніцтве ў рэалізацыі канцэпцыі будаўніцтва эканамічнага пояса Шаўковага шляху. «Узаемадзеянне з кітайскім бокам і іншымі дзяржавамі, удзел у развіцці перавозак у напрамку Усход — Захад — Усход ужо сёння дазваляюць знізіць кошт перавозак у пазначаным напрамку і павысіць канкурэнтаздольнасць чыгуначнага транспарту ў Еўразійскіх транспартных патоках», — запэўнілі ў міністэрстве.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «Квадраты» на экспарт

Рашэннем працаваць на замежных рынках нашы будаўнікі забілі двух зайцаў. Па-першае, развіваюць экспарт, а па-другое — такім чынам сталічныя прадпрыемствы кампенсуюць спад попыту на ўнутраным рынку.

Больш паспяховаму прасоўванню на замежжа перашкаджаюць канкурэнцыя як сярод мясцовых кампаній, так і з боку іншых экспарцёраў. Сярод «жалезабетонных» пераваг нашых будаўнікоў — якасць і хуткасць.

Мінулы год быў няпросты для нашых будаўнікоў, але з пачатку 2018-га галіна пачынае ажываць. Замацаваць уздым павінны новыя тэхналогіі і экспарт не толькі матэрыялаў, але і праектных, будаўнічых паслуг.

Беларускіх спецыялістаў ведаюць у Венесуэле, Туркменістане, Азербайджане. Цаглінка да цаглінкі складваецца супрацоўніцтва з расіянамі. Беларусы ўзводзілі дамы і сацыяльныя аб'екты ў Пскоўскай, Калінінградскай абласцях і Рэспубліцы Комі. Геаграфія пашыраецца — партнёрства ў будаўніцтве «пад ключ» прапанавалі губернатару Валагодчыны, які завітаў на выстаўку «Белагра-2018». Паслугі ў праектаванні і ўзвядзенні жылля, інфраструктурных, інжынерных і сацыяльных аб'ектаў месяц таму абмяркоўваў беларускі пасол Ігар Петрышэнка з кіраўніцтвам Уладзімірскай вобласці. Асаблівыя адносіны ў айчынных будаўнікоў з Калугай. У расійскім горадзе ўжо ёсць свая «Малінаўка», дый не адна. А ў горадзе Обнінск, што за 70 кіламетраў ад абласнога цэнтра, узведзены камфартабельны «Беларускі квартал».

Пацíху крочаць нашы будаўнікі і ў Еўрапейскі саюз. Сёння сталічныя спецыялісты ўзводзяць жылы комплекс у Літве. Некаторыя ідэі і тэхналогіі плануюць у будучыні прымяніць і на радзіме.

## Код доступу

Пры класіфікацыі экспарту паслуг можна вылучыць дзве групы — традыцыйныя і «новыя». Першыя патрабуюць непасрэднага кантакту прадаўца з пакупніком. Тут застаюцца выдаткі на транспарт, залежнасць ад цаны на нафту і інш. Да іх адносяцца транспартныя, будаўнічыя і медыцынскія паслугі.

Другую групу складаюць паслугі, якія звязаны з развіццём новых тэхналогій. Знікаюць неабходнасць непасрэдных зносін з прадаўцом і выдаткі на дастаўку. Такія паслугі маюць магчымасць матэрыялізавацца.

«Калі мы пішам софт, ён становіцца часткай пэўнага прадукту: тэлевізара, тэлефона. Гэта значыць, што паслугі захоўваюцца. Звычайна яны не маюць гэтай уласцівасці. Растуць «новыя» паслугі шалёнымі тэмпамі. Калі трапіш на гэтую хвалю, будзеш развівацца разам. Гэта дасягненне для эканомікі любой краіны. Звычайна складваецца меркаванне, што гандаль паслугамі — прывілей развітых краін. Але сёння многія дзяржавы пераскокваюць этап развіцця прамысловасці і адразу інвестуюць у паслугі. І як паказваюць апошнія даследаванні, выйграюць ад гандлю паслугамі якраз эканомікі, якія развіваюцца», — заўважае Юлія Вашкевіч.

Вялікія магчымасці для нашага IT-сектара адкрыў дэкрэт аб развіцці лічбавай эканомікі і Парк высокіх тэхналогій. Пра гэта ўжо напісана і сказана многа. «Важна адно: звыклая нам індустрыяльная эканоміка на нашых вачах адыходзіць у мінулае», — адзначыў **першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ** некалькі тыдняў таму ў Палаце прадстаўнікоў, абмяркоўваючы з дэпутатамі Дэкрэт № 8.

Калі гэта так, то трэба збіраць сілы і рыхтаваць рэсурсы, каб ускочыць у цягнік, які на поўным ходзе накіроўваецца да постіндустрыяльнага грамадства. Яго аснова — вытворчасць паслуг, над якой плённа працуюць спецыялісты Парка высокіх тэхналогій. Больш за 90 % праграмнага забеспячэння, створанага ў беларускай сіліконавай даліне, ідзе на экспарт у ЗША, Германію, Вялікабрытанію, Швейцарыю, Ірландыю і іншыя краіны.

Валютная выручка рэзідэнтаў галоўнага IT-кластара краіны за пяць месяцаў 2018-га вырасла на 30 % у параўнанні з мінулым годам. І гэта стала магчыма пасля рэкорднага 2017-га, калі даход усіх рэзідэнтаў установы склаў 1,3 млрд долараў.

Прыкладна за паўгода колькасць членаў ПВТ вырасла больш чым на 100 кампаній. Калі такія тэмпы захаваюцца, то ў 2018-м у парк уступіць больш рэзідэнтаў, чым за ўсе папярэднія гады.

Сёння ў склад ПВТ уваходзяць амаль 300 кампаній. Некаторыя з іх — даччыныя юрыдычныя асобы, якія належаць замежным прадпрыемствам і ствараюць кантэнт менавіта для сваіх уладальнікаў. Прадукцыя такіх рэзідэнтаў адносіцца да ліку экспарту. Засноўваюць прадпрымальнікі такія даччыныя фірмы, каб прыцягнуць да працы беларускіх інжынераў.

## Пункты росту

Асноўныя сферы, якія сёння асабліва перспектыўныя для экспарту паслуг, — адукацыя, медыцына і турызм.

Напрыклад, сёння ў вядучым эканамічным універсітэце краіны, БДЭУ, атрымліваюць адукацыю на розных ступенях больш за 700 замежных студэнтаў з 26 краін свету. Прыцягненне замежных студэнтаў — адзін з прыярытэтаў дзейнасці ўніверсітэта. Як адзначаюць супрацоўнікі, попыт ёсць — гэта радуе, але ўсё роўна маем магчымасці рабіць больш. Адна з апошніх тэндэнцый для БДЭУ: кітайскія студэнты, якія плануюць працаваць у індустрыяльным парку «Вялікі камень».

Большасць замежных студэнтаў у беларускіх ВНУ — з постсавецкіх краін. Гэта і зразумела: адсутнічае моўны бар'ер і ўзровень адукацыі зарэкамендаваў сябе яшчэ з часоў СССР. Але зусім іншы геаграфічны патэнцыял адкрыецца, калі выкладчыкі будуць размаўляць з замежнымі студэнтамі на адной мове — у прамым сэнсе. Для гэтага трэба развіваць адукацыю на замежных мовах, ствараць адпаведныя праграмы. Многія ВНУ краіны ўжо актывізуюць сваю дзейнасць у гэтым кірунку.

Часта беларусы ствараюць выдатныя паслугі і тавары, а інфармуюць пра іх недастаткова. Гэта актуальна і для сферы турызму. Ёсць бязвізавы рэжым праз сталічны аэрапорт, ініцыятыву пераймаюць рэгіёны, а турыстычныя паслугі не дацягваюць да жаданага ўзроўню. Эканаміст бачыць карані праблемы ў нашым менталітэце: «Можна адкрыць мяжу, а як і чым будзем прыцягваць? Нам трэба навучыцца прыбіраць характэрны беларускі скепсіс да саміх сябе і глядзець на краіну вачыма замежніка».

Спецыялісты ў сферы медыцынскага турызму заўважаюць, што для курса аздараўленчых працэдур мала бязвізавых пяці дзён. «Але пашырэнне калідора бязвізу актуальнае толькі для нізкацанавой катэгорыі паслуг. Для тых, хто едзе па высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу, кошт візы не будзе мець значэння. І ўсё роўна недастаткова ведаюць пра нас, як вынік — недастаткова давяраюць. Пры ўсіх іншых плюсах выбар зробяць на карысць таго ж Ірана, які славіцца сваёй медыцынай», — лічыць эканаміст.

Паслугі становяцца лакаматывам экспарту. У Беларусі ёсць ужо напрацоўкі ў гэтым напрамку. Прадукцыйна развіваюцца сферы-лідары, але здабыткаў чакаюць і ад іншых галін. Адно са слабых месцаў тут — маркетынг. Нашым паслугам не хапае прасоўвання на знешнім рынку. «Маркетынг па міжнародных правілах складаецца з валодання замежнымі мовамі, знаёмства з асаблівасцямі культуры. Трэба ведаць, каму ты прапаноўваеш тавар і на чым факусаваць увагу. Гэта, на мой погляд, асноўныя праблемы», — адзначае эксперт Юлія Вашкевіч.

**Марыя ДАДАЛКА.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** камнеподборщик ПК-6KIVIPEKRA (тип – полунавесная, привод – от ВОМ трактора, производительность – 1,8-3,6 га/час, удельный расход топлива – 10 кг/га, рабочая ширина захвата – 6 метров, рабочая скорость – 3-6 км/час, транспортная скорость – 15 км/час, масса – 4300 кг, габаритные размеры в рабочем положении: длина – 6000 мм, ширина – 6900 мм, высота – 2600 мм, объем бункера – 1,5-2,0 куб. м, размер убираемых камней – 4-30 см)

Начальная цена продажи – 22 848 руб. (двадцать две тысячи восемьсот сорок восемь рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 285 руб. (две тысячи двести восемьдесят пять рублей)

Продавец – Открытое акционерное общество «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, тел. 8 01514 411-79

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 26 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 23 июля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*



**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1**
– Капитальное строение, инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121К.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 2070,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 68,6 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 81,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 104,5 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 228,7 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 61,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху.
– Капитальное строение, инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть (внеплощадочная)), протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
– шкаф распределительный ПР-24-7208;
– трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1;
– распределительный пункт ПР-24-11-7205;
– трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;
– трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2;
– распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ;
– теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»;
– туя (1 единица)

Земельный участок, на котором расположен объект:
– кадастровый номер 440100000002008242, площадью 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С-69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С-69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С-69021)) по адресу: г. Гродно ул. Максима Горького, 121К.
– кадастровые номера 440100000002006868 (0,0007 га), 440100000002006869 (0,0007 га), 440100000002006871 (0,0003 га), 440100000002006872 (0,0002 га), 440100000002006873 (0,0002 га), 440100000002006874 (0,0003 га), 440100000002006875 (0,0037 га), 440100000002006876 (0,0002 га), 440100000002006877 (0,0003 га), 440100000002006878 (0,0003 га), 440100000002006879 (0,0312 га) (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121

Начальная цена продажи – 134 530,13 руб. (сто тридцать четыре тысячи пятьсот тридцать рублей тринадцать копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 6 726 руб. (шесть тысяч семьсот двадцать шесть рублей)

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. **Окончание приема заявлений** 08.08.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объектов Курленко Иван Семенович, тел. 8 (029)2152255

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Камунальныя стасункі

# Я КРЫХУ ПАШУМЛЮ?

## Што і калі можна падчас рамонту

**Кожны з нас сутыкаецца з неабходнасцю невялікага бытавога рамонту ў сваёй кватэры. Камусьці трэба будзе дываны перавесіць, іншым — балкон абшаляваць, падлогі перасласць, замяніць сантэхніку і іншае. Пры гэтым гаворка не ідзе аб глабальным рамонце, а ўсяго толькі аб паляпшэнні камфортнасці жылля. Але што рабіць, калі працуеш увесь тыдзень, а час для рамонту застаецца толькі ў выхадныя? Ці можна карыстацца дрылём і іншымі «шумнымі» інструментамі, калі астатнія суседзі заслужана адпачываюць і могуць «у штыкі» ўспрыняць гэтыя работы ў вашай кватэры? Давайце разбяромся ў гэтым пытанні. Што можна і калі нельга?**

### Не свідраваць, а то аштрафуюць

Спачатку вызначымся з пералікам работ, якія выконваць у выхадныя наогул нельга. Дык вось, як паведамляе партал камунальнай адукаванасці, усе работы па пераўладкаванні і перапланіроўцы, якія ствараюць шум або вібрацыю, у выхадныя (суботу і нядзелю), а таксама святочныя дні заканадаўствам забароненыя. У будныя дні пачынаць такія работы раней за 9 гадзін і заканчваць іх пазней 19 гадзін таксама нельга. Калі парушыць гэтыя правілы, суседзі маюць права паскардзіцца — і вас аштрафуюць. Што ж адносіцца да перапланіроўкі кватэры?

Выконваць многія з гэтых работ без спецыяльных узгадненняў з выканкамам не толькі ў выхадныя, але і ў працоўныя дні нельга. Такім чынам, да работ па перапланіроўцы ў кватэры адносяцца:

— замена або перанос сістэм газазабеспячэння, цэнтральнага ацяплення, смеццявыдалення і газавыдалення;

— устройванне гідра-, пара-, цепла- і гукаізаляцыі;

— змены ў апорных канструкцыях;

— павелічэнне (памяншэнне) плошчы, колькасці жылых пакояў і падсобных памяшканняў у кватэры за кошт разборкі існуючых перагародак;

— змена плошчы і колькасці памяшканняў у ізаляваных нежылых памяшканнях за кошт разборкі існуючых перагародак;

— павелічэнне праёмаў у ненясучых сценах і перагародках.

Дарэчы, перарабляць лоджыі ва ўцеплены пакой закон наогул забараняе.

### Цішыня з 23.00 да 7.00

Іншыя работы перапланіроўкай або перабудовай не лічацца, што азначае: уцяпляць або абшываць сцены ў кватэрах і лоджыях, усталёўваць падвесныя столі, змяняць падлогавае пакрыццё, сантэхніку, дзверы ў пакоях і іншае можна і ў суботу, і ў нядзелю, і ў святочныя дні. Але... Тут галоўнае, што будуць выконвацца ўмовы захавання Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі. Апошнія кажуць пра тое, што ў перыяд з 23 да 7 гадзін не павінны ажыццяўляцца дзеянні, якія ствараюць вібрацыю і шум (у тым ліку выкананне бытавых (рамонтных) работ, правядзенне ручных пагрузачна-разгрузачных работ, рэзкае закрыццё дзвярэй і іншыя дзеянні).

Вядома, акрамя захавання заканадаўчых нормаў, неабходна яшчэ кіравацца і здаровым сэнсам — наўрад ці суседзяў узрадуе працяглая работа дрыля ці пастаянны грукат і шум кожны выхадны.

### Рамонт без бойкі

Як жа ўсё-такі зрабіць рамонт і не пасварыцца з тымі, хто жыве побач? Грунтуючыся выключна на вопыце тых, хто рабіў рамонт у кватэры, можна прапанаваць некалькі парад, якія будуць вельмі карысныя.

**Па-першае,** суседзяў трэба папярэдзіць, што вы плануеце ў найбліжэйшыя выхадныя правесці рамонт і трошкі пашумець, папрасіўшы іх паставіцца да гэтага паблажліва. Галоўнае правіла тут — ветлівасць. Дарэчы, у некаторых таварыствах уласнікаў заключаюць з усімі жыхарамі своеасаблівы дагавор, у якім яны абавязваюцца пры неабходнасці выконваць работы ў зручны суседзям час.

**Па-другое,** падчас рамонту лепш засцерагчы і сябе, і сваіх суседзяў ад рознага роду непрыемнасцяў: напрыклад, працёкаў (што магчыма пры змене сантэхнікі і труб), засмечанасці труб (калі мыць у ракавіне інструменты, запэцканыя ў гіпсе, цэменце і іншых будаўнічых сумесях). Акрамя гэтага, трэба паклапаціцца і пра вываз смецця, якое пасля маштабнага рамонту запасіцца ў вялікіх аб'`ёмах. Кантэйнеры ў дварах прызначаныя выключна для бытавых адходаў. А калі вы заб'яце іх рэшткамі старой сантэхнікі ці кавалкамі тынкоўкі, канфліктаў з суседзямі не пазбегнуць.

**Па-трэцяе,** калі вы робіце рамонт не сваімі рукамі, а звяртаецеся па дапамогу да іншых работнікаў, папрасіце будаўнічую брыгаду выконваць шумныя работы з перапынкамі, магчыма, суседскім дзецям ці старым трэба паспаць днём. Растлумачце работнікам, што пры ўзнікненні канфліктнай сітуацыі з суседзямі яны павінны спыніць работу. Акрамя таго, неабходна будзе вырашыць пытанне прыборкі, паколькі наўрад ці пры маштабным рамонце будзе чыста не толькі ў кватэры, але і ў пад'ездзе.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# «ГЭТА — ВАША ЗЯМЛЯ, І НЯМА ЛЕПШАЙ ЗА ЯЕ»

### ГЛЫБІНКА ПРЫЦЯГВАЕ КАПІТАЛ

**— На Мёршчыне самыя вялікія ў краіне запасы журавін, таму раён па праве можа лічыцца самым журавінавым. Да якіх яшчэ асаблівасцяў рэгіёна можна прымяніць эпітэт «самы»?**

— Сапраўды, на тэрыторыі нашага раёна самае вялікае ў краіне, і адно з самых вялікіх у Еўропе, верхавое балота — Ельня. 20 з лішнім тысяч гектараў у нас, пяць тысяч — у Шаркаўшчыне. Унікальная экасістэма, якую называюць лёгкімі Еўропы. Менавіта гэтаму прыроднаму рэсурсу прысвечаны наш экалагічны фестываль «Жураўлі і журавіны», які мы ладзім штогод з 2012 года.

Мёрскі раён — самы экалагічна чысты і адзін з самых перспектыўных. Мы развіваем прамысловасць, але захоўваем усе тэхналагічныя патрабаванні. Калі ёсць рэсурсы, мы павінны іх рацыянальна выкарыстоўваць, каб пакінуць для дзяцей і ўнукаў.

Будаўнічая пляцоўка ММПЗ.



Тое ж балота мае вялікія паклады торфу. Яшчэ ў савецкія часы там былі распрацоўкі, якія потым зараслі лесам і цяпер стаяць пустыя, вылучаюць вуглякіслы газ. Мы можам, не парушаючы экалогію, выбраць частку торфу, зрабіць торфабрыкетнае прадпрыемства альбо вырабляць пажыўныя грунты, потым паўторна забалоціць. Калі раён больш заробіць, то і ў экалогію больш укладзе. Ахоўныя мерапрыемствы таксама патрабуюць сродкаў, дзе іх узяць, як не ў матэрыяльнай вытворчасці?

**— Адной з такіх крыніц даходаў для раёна стане Мёрскі металапракатны завод?**

— ММПЗ яшчэ не ўведзены, а ўжо мяняе жыццё раёна да лепшага. Калі мы пачыналі яго будаваць, я не мог нават уявіць многія рэчы, якія, у сувязі з гэтым прадпрыемствам, у нас з'явяцца. Канешне, гэта новыя працоўныя месцы, годныя заробкі, добрыя адлічэнні ў бюджэт, якія раён зможа ўкладаць у сферу адукацыі, на ўтрыманне дарог, і, безумоўна, на ахову нашай унікальнай прыроды. На ўсё гэта нам зараз грошай не хапае. Таму эпітэт «самы» вы можаце прымяняць да розных рэчаў.

**— Самы амбіцыйны?**

— Можа быць і так. Гэта цалкам нармальныя амбіцыі, якія падмацаваны канкрэтнымі дзеяннямі. Дзякуючы распараджэнню кіраўніка дзяржавы, мы нядаўна адкрылі бальніцу, якую каля 30 гадоў чакалі. Цяпер езджу міма — душа радуецца. Мая мара была — здаць бальніцу, а зараз мы ўжо праектуем новую паліклініку, і ўжо два гады працуем над стварэннем міжрэгіянальнага кардыяцэнтра, які будзе абслугоўваць шэсць раёнаў. Ці мог я пра такое падумаць раней?! Гэта стала магчымым, дзякуючы будаўніцтву завода, дзякуючы знаёмству з інвестарамі, якія сюды сталі актыўна прыязджаць. У нас жыццё кіпіць. Раней Мёры ведалі толькі як цудоўнае месца адпачынку, цяпер гэта прывабны рэгіён для ўкладання грошай.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Глыбінка мае свае перавагі. Калі да чыстага паветра дадаць камфортнае жыллё, цікавую работу, добры заробак, якасныя школу і медыцынскае абслугоўванне, тады чалавек іншага месца шукаць не стане. Наўрад ці ў нас у найбліжэйшы час з'явіцца ВНУ, але важна, каб моладзь пасля атрымання вышэйшай адукацыі сюды вярнулася і тут, на гэтай зямлі, прымяніла атрыманыя веды.

Я кажу выпускнікам нашых школ: «Больш роднага месца ў вас няма. Гэта — ваша зямля, і няма лепей за яе». І калі са 120 маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць сюды, 80 — нашы, я — шчаслівы чалавек.

### ЗАДАЧА БЫЛА — ВЫТРЫМАЦЬ ДВА ГАДЫ

**— Вы дзясяты год узначальваеце раён. Як ён мяняўся за гэты час?**

— Спрадвеку склалася так, што наша прамысловая перапрацоўка звязана з сельскай гаспадаркай. Ад ураджаю збожжавых залежыць работа камбіната хлебапрадуктаў і камбікормавага завода, ад работы жывёлагадоўлі — мясакамбіната.

Разам з тым на працягу апошніх гадоў колькасць насельніцтва ў сельскай гаспадарцы няўхільна змяншалася. Мы імкнёмся выправіць сітуацыю, палепшыць умовы работы. І цяпер людзі сталі вяртацца.

Але на нейкім этапе мы дасягнулі паталка ў развіцці. У выніку паваліліся сыравінныя зоны, у прамысловых прадпрыемстваў узнікла запазычанасць, і на раён лягла неабходнасць трымаць уласнымі рэсурсамі і камбікормавы завод, і мясакамбінат. Да гэтага збожжа і мяса паступала з чатырох раёнаў, а тры гады таму мы засталіся з перапрацоўчымі прадпрыемствамі сам-насам. Мая задача была — вытрымаць два гады. Мы вытрымалі. Мясакамбінат не закрыўся, камбікормавы завод не разваліўся. Зараз створана інтэграцыйная структура — Віцебскі канцэрн «Мяса-малочныя прадукты», куды ўвайшлі і мясакамбінат, і камбікормавы завод, і шэсць сельскіх гаспадарак раёна.

З 2010 да 2014 года ўкладалі сілы і грошы ў мадэрнізацыю. На камбікормавым заводзе ўстанавілі самае сучаснае на той момант дацкае абсталяванне. Цяпер, напрыклад, можам рабіць корм, у склад якога ўваходзяць 28 кампанентаў. На мясакамбінаце зрабілі новы халадзільнік, пабудавалі новую кацельную. Сабекошт стаў зусім іншы. Сёння наш мясакамбінат — адзіны ў Беларусі, які выпускае ахалоджаныя паўфабрыкаты з тэрмінам прыдатнасці 45 сутак. Гэта наша ноу-хау, якое значна павысіла рэнтабельнасць і дазволіла заводу ўпершыню за многія гады выйсці на прыбытак.

Нельга сказаць, што я прыйшоў і зрабіў тут нейкую рэвалюцыю. Каманда засталася тая ж самая. Гэта плённая, карпатлівая штодзённая праца. Мы штогод нешта робім: па добраўпарадкаванні, па мадэрнізацыі. Я ўжо ведаю, што будзе выпрабляць Мёрскі металапракатны завод у 2025 годзе.

**— Наколькі будучы завод будзе забяспечаны рынкамі збыту?**

— Кампанія ўжо падпісала папярэднія кантракты з арабскімі краінамі, Канадай... У чэрвені 2019 года запусцім поўным цыклам першы этап завода магутнасцю 150 тысяч тон у год, а кантрактаў ужо падпісана на 200 тысяч тон. Другі этап, праз паўтара года, — 240 тысяч тон. І гэта не ўсё.

**— У 2009 годзе перспектыва гэтак жа выразна праглядалася?**

— Мне даверылі раён, які трэба было не разваліць. Для мяне гэта былі новыя мясціны, трэба было пазнаёміцца з людзьмі, даведацца пра патэнцыял, на што спатрэбіўся год. Тады той жа мясакамбінат меў вельмі добрыя паказчыкі, але абсталяванне там мелася такое, што было відавочна: праз два гады рост скончыцца. Камбікормавы завод таксама прыбаўляў па 20—40 %, але працаваў на пасляваенных сушылках і млынах. І паказчыкі росту вытворчасці — гэта адно, а прывага жывёлы, якую кормяць такім камбікормам, — іншае.

Калісьці мне казалі: у Мёрах лесу шмат, трэба наладзіць выраб пiламатэрыялаў. Але я не бачыў рынкаў збыту. За гэтыя амаль 10 гадоў чатыры разы вяртаўся да ідэі з перапрацоўкай торфу. Былі праекты па вырабе спажыўных грунтоў, паліўных пелет, актываванага вугалю для вадзяных фільтраў. Знаходзіліся інвестары. Але сітуацыя ў эканоміцы не спрыяла. Мы павінны добра разумець: галоўнае не вырабіць, галоўнае — прадаць. Ляжаў торф 20 гадоў — паляжыць яшчэ некалькі, пакуль не складуцца найбольш аптымальныя рынкавыя ўмовы для адкрыцця новага прадпрыемства.

### ЧАСАМ НАВЯЗВАЮ СВАЕ ІДЭІ

**— Дык вы рынаўнік?**

— Я — аграрый.

**— Але разважаеце як дзелавы чалавек.**

— Нас наняла дзяржава ў якасці менеджараў. Наша задача: ствараць умовы для выхаду рэгіёна, яго прадпрыемстваў, на прыбытак. Для дзелавога чалавека асабістае вышэй за грамадскае. Для мяне — грамадскае вышэй. Мой асабісты інтарэс у тым, каб жыхары Мёршчыны былі больш багатыя. Чым больш людзі зарабляюць, тым больш яны выдаткоўваюць на паслугі, і тым больш яны пакідаюць грошы ў бюджэце. Багаты раён — гэта багатыя людзі, якія тут жывуць.

Успенскі касцёл.



mijory.by

**— Што тут залежыць ад работы выканаўчай улады?**

— Калі б мы не рызыкавалі, то нічога б не было: ні ММПЗ, ні іншага. Я прыехаў сюды з Бешанковічаў. Праз год перавёз сям'ю і тады пачуў, як людзі кажуць «наш старшыня». Тады зразумеў, што людзі мне паверылі, і я з імі змагу зрабіць усё, і не магу іх падмануць.

Не варта чакаць, што ініцыятыва прыйдзе знізу. Часам навязваю свае ідэі. Не ўсе і не заўсёды пагаджаюцца адразу. Але потым кажуць: ты меў рацыю. Я таксама памыляюся. У нас зараз столькі праектаў у распрацоўцы, што калі нават 20 % ад іх рэалізуем, гэта ўжо будзе добры крок наперад. Далёка не ўсё атрымліваецца. Але я не пагаджуся проста займаць пасаду і атрымліваць заробак. Рызыкую, атрымліваю вымовы, але гэта мая работа і маё жыццё.

Я сёння ўдзячны сваёй камандзе, з якой мы робім тое, што неабходна Мёршчыне. Тое, што акрамя нас ніхто не зробіць. Ва ўсіх маіх намеснікаў грамадскае вышэй за асабістае.

**— Тутэйшыя людзі адрозніваюцца ад жыхароў усходніх раёнаў вобласці?**

— Безумоўна, знаходжанне ў складзе Польшчы да 1939 года пакінула свой адбітак. Тут, напрыклад, захаваліся шыкоўныя касцёлы. Уплыў рэлігійных арганізацый большы. Таму супрацоўнічаю з імі. Напрыклад, у барацьбе са згубнымі звычкамі. Мне, дарэчы, прапаноўвалі ўвесці ў раёне пэўныя забароны, якія датычацца алкаголю. Але лічу, што забарона — не метад. Трэба вучыцца культуры спажывання.

У нас 80 % насельніцтва адносяць сябе да праваслаўных і 20 % — да католікаў. Я сам — праваслаўны, але ў мяне добрыя адносіны з католікамі, часта заходжу да ксяндза, і ён да мяне прыходзіць. Мы дапамаглі сабраць грошы на рэканструкцыю аргана. І цяпер арган ва Успенскім касцёле ў Мёрах — гэта цуд, які варта пачуць кожнаму.

**— Цяпер у райцэнтры шмат прыезджых, якія будуюць завод. Гэта дадае галаўнога болю праваахоўнікам і вам, як кіраўніку раёна?**

— Мы рыхтаваліся да гэтага. І вялікіх праблем пакуль няма. Спачатку было некалькі сутыкненняў паміж маладымі прыезджымі і мясцовымі, як правіла, з-за дзяўчат, і як правіла — у выхадныя дні. За тры гады мы адправілі назад 28 чалавек і забаранілі ім вяртацца. У нас вельмі канструктыўныя адносіны паміж начальнікам РАУС і кіраўніцтвам будаўнічай кампаніі. Таму не зачыняем кафэ, прадаём алкаголь і дазваляем пець песні, калі гэта нікому не перашкаджае. У выніку крымінальная абстаноўка ў нас не пагоршылася.



mijory.by

**— На дэмаграфічную сітуацыю будаўніцтва завода яшчэ не паўплывала?**

— Спадзяюся, што паўплывае. Ніхто не супраць, каб добрыя людзі тут ажаніліся і засталіся. Дзяўчаты на Мёршчыне вельмі прыгожыя.

**— Мы з вамі сустракаемся якраз пасля пасяджэння выканкама. Якія пытанні абмяркоўвалі?**

— Самае галоўнае — гатоўнасць сельскагаспадарчых арганізацый да ўборкі збожжавых і сяўбы азімых. Хутка пачнём. Таму абмяркоўвалі рамонт камбайнаў, наяўнасць механізатараў, умовы для засыпкі, захавання насення.

Разглядалі работу бібліятэк. Наш раён змог захаваць бібліятэчную сетку. Даручыў старшыні райсавета, райфінаддзелу вывучыць магчымасць набыць для яе сёлета 20 камп'ютараў. Гэтак жа летась мы вырашылі праблему з аўтатранспартам для аддзела па адукацыі — набылі сем аўтобусаў. Цяпер гадоў пяць можна спаць спакойна.

**— Якія разлікі на ўраджай на Мёршчыне?**

— На Мёрскай зямлі жыве Бог. У нас таксама амаль 40 дзён не было ападкаў, але потым дождж ішоў два дні, і сітуацыя змянілася карэнным чынам. Патрэбныя работы на збожжавым кліне мы зрабілі ўсе. Так што катастрофы не бачу і спадзяюся на лепшае. Разлікі на ўраджай добрыя.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*г. Мёры.*



Балота Ельня.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ігуменскі тракт
№ 12 (210)



■ Практычнае радзімаўства

# 20 ЦІ 40?

## Даследчыкі шукаюць адказ на пытанне: колькі дакладна будынкаў у Гомелі пабудаваў знакаміты архітэктар Станіслаў Шабуneўскі



**У сучасным Гомелі захавалася не так шмат помнікаў старажытнай архітэктуры, як верагодна, хацелася б яго жыхарам. Але ж тыя будынкі, якія перажылі выпрабаванні часам, заўсёды ўражваюць і звяртаюць на сябе ўвагу. Менавіта па іх архітэктары і краязнаўцы вывучаюць гісторыю горада над Сожам. Многія маюць аўтарства дойліда Станіслава Шабунеўскага.**

Знакаміты архітэктар нарадзіўся роўна 150 гадоў таму. І гэта дало падставу адкрыць у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі выстаўку, прысвечаную чалавеку, які ствараў традыцыі горадабудаўніцтва на Гомельшчыне. Залу, дзе адбывалася прэзентацыя, запоўнілі маладыя людзі, будучыя архітэктары — студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Тыя, хто толькі марыць пабачыць свае малюнкі-праекты ўвасобленымі ў жыццё.

Дарэчы, вучацца яны цяпер у адным з тых будынкаў, якія належаць аўтарству Шабунеўскага. Некалі малады інжынер, які толькі закончыў Пецярбургскі ўніверсітэт, выйграў конкурс на найлепшы праект мужчынскай гімназіі ў Гомелі. Цяпер там БелДУТ. Гімназію ў самым канцы пазамінулага стагоддзя ўзвялі за два гады ў псеўдагрэчаскім стылі з чырвонай цэглы. З гэтай пабудовы пачала імкліва развівацца кар'ера таленавітага архітэктара. Начальнік упраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама, галоўны архітэктар Гомельскай вобласці Святлана Кухацкаволец адзначае, што творчасць Шабунеўскага захапляе і ўражвае і сёння:

— Ён ствараў тое асяроддзе, якое да гэтага дня ўпрыгожвае абласны цэнтр. Насамрэч, калі глядзіш на пабудовы Шабунеўскага, здзіўляешся. Калі проста побач праходзіш, адчуваеш натхненне, якое перажываў некалі сапраўдны мастак.

Загадчыца мастацкага аддзела Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Таццяна Літвінава падкрэслівае, што сёння Гомель нельга ўявіць без архітэктурных помнікаў канца XIX — пачатку XX стагоддзя аўтарства Шабунеўскага, якія захаваліся, нягледзячы на ўсе складанасці часу:

— Самымі імпазантнымі з іх з'яўляюцца будынкі банкаў, бальніц, офісных і жылых пабудоў, якія заўсёды арганічна ўпісваліся ў гарадскі пейзаж. Тут класіцызм, мадэрн, канструктывізм... Вуліцу Савецкую ўпрыгожваюць будынкі былых Арлоўскага і Віленскага камерцыйных банкаў. Радуе вока лініямі ў стылі мадэрн былы дом купца Грошыкава. Як і раней, служаць людзям карпусы бальніцы (цяпер хуткай дапамогі), пабудаваныя ў гады Першай сусветнай вайны. Архітэктар кіраваў асушэннем Гарэлага балота, будаўніцтвам гарадскога водаправода. Пад яго наглядам адбывалася аднаўленне часткі палаца Паскевічаў, якая пацярпела ад пажару ў 1919 годзе.



Юныя архітэктары на выстаўцы Станіслава Шабунеўскага.

Здаецца, усе ў Гомелі ведаюць прыгожы Палац грамадзянскіх абрадаў, які таксама спраектаваў Станіслаў Шабунеўскі. Між тым першапачаткова будынак узвялі як дом урача Навума Аляксандрава. Шасціпавярховы дом-камуна ў даваенным Гомелі быў самым высокім будынкам. У ім меліся доўгія калідоры з вялікай колькасцю кватэр і агульнымі кухнямі. «Круглы шэры дом» па вуліцы Пушкіна, 26 быў тады заўважны здалёк дзякуючы незвычайнай яскравай абліцоўцы. Дом культуры чыгуначнікаў узводзілі ў 1924—1927 гадах пры непасрэдным удзеле Станіслава Данілавіча. У далейшым яго не раз перабудоўвалі, але аўтарскі почырк заўважны і дагэтуль.

Вывучэнне спадчыны Станіслава Шабунеўскага далёкае ад завяршэння. Навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, аховы гісторыка-культурнай спадчыны Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Юрый Панкоў у архівах вывучаў перыядычныя выданні канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Высветліў, што ў газетных нарысах гаворыцца і пра іншыя будынкі, якія таксама маюць аўтарства вядомага дойліда:

— Напрыклад, гэта Праабражэнская званіца, якая захавалася да нашых дзён. Пабудавана яна ў рускім стылі і тады ўяўляла сабой двух'ярусную васьміграную вежу. У гады вайны знік верхні ярус. Таксама на старонках газеты «Палеская праўда» мы знайшлі паведамленне пра тое, што ў 1930 годзе Шабунеўскаму даручылі за 10 дзён распрацаваць праект лазні і пральні. Праект быў зацверджаны праз 20 дзён. Прапускная здольнасць аб'екта складала 250 чалавек у дзень. Будынак быў зроблены ў стылі канструктывізму. У гады Вялікай Айчыннай вайны галоўны фасад узарвалі, а пасля яго аднавілі ў стылі нэакласіцызму.

Лазня і сёння адпавядае свайму прызначэнню, як і многія іншыя, але не ўсе пабудовы. Многія даследчыкі ўпэўнены ў тым, што Станіславаў Данілавіч мае непасрэднае дачыненне да праекта Мікольскай Палескай царквы, якую ў 1904 годзе пабудавалі на сродкі рабочых Лібава-Роменскай чыгункі. Сёння тут размешчаны Свята-Мікольскі мужчынскі манастыр.

Дацэнт кафедры архітэктуры БелДУТа, кандыдат мастацтвазнаўства Яўген Малікаў гаворыць, што калі ў будынку, які стварыў некалі знакаміты архітэктар, вучацца будучыя яго калегі, то ажыццяўляецца творчая пераемнасць яго ідэй:

— Калі паглядзець на яго спадчыну асацыятыўна, можна значна павялічыць спіс аб'ектаў, ім спраектаваных. Пра два дзясяткі, якія захаваліся, дакладна вядома, а яшчэ столькі ж можна дадаць. Проста пакуль афіцыйна не пацверджана, што яны належаць менавіта яго аўтарству. Магчыма, мы яшчэ будзем адкрываць невядомыя старонкі жыцця і творчасці Станіслава Шабунеўскага. Тым больш што ім шмат будынкаў было спраектавана і для суседзяў у Бранскай і Чарнігаўскай абласцях. Пакуль гэта толькі версія, якую трэба ўдакладняць.

Між тым дагэтуль імя знакамітага дойліда не ўвекавечана ніякім чынам. На вернісажы прагучалі прапановы, улічваючы ўнёсак Станіслава Шабунеўскага ў развіццё Гомеля, ушанаваць яго імя ў скульптуры ці тапаграфіі горада, якому ён так аддана служыў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

***Нарадзіўся архітэктар у 1868 годзе ў збяднелай шляхецкай сям'і — у вёсцы Скароднае, цяпер Ельскага раёна. Яго бацька служыў пачтаром, пазней памочнікам пашмайстра павятовай паштовай канторы Бабруйска. Станіслаў скончыў гімназію ў Слуцку, затым вывучыўся ў Санкт-Пецярбургу на архітэктара. У 1897 годзе прыехаў у Гомель і пачынаў працаваць у будаўнічым аддзеле Лібава-Роменскай чыгункі.***

***Рэвалюцыя пакінула цень на лёсе вядомага архітэктара. У 1919 годзе яго пазбавілі права абірацца ў кіруючыя савецкія органы. У верасні 1922-га пасля службы ў Чырвонай арміі ён вярнуўся ў Гомель, уладкаваўся інжынерам у «Палесбуд». Не прайшло і паўгода, як яго прызначылі інспектарам па будаўніцтве. У маі 1924-га Шабунеўскі стаў губернскім інжынерам, а ў 1927-м — інжынерам Гомельскай акругі. Праз 10 гадоў Станіслаў Данілавіч трапіў пад рэпрэсіі. У 1937 годзе яго арыштавалі па лжывым даносе і засудзілі на 10 гадоў лагераў. Дзесьці на будаўніцтве Беламорканала закончылася жыццё 69-гадовага архітэктара. Справу Шабунеўскага закрылі праз 20 гадоў пасля яго смерці — за адсутнасцю складу злачынства. Рэабілітавалі яго толькі ў 1989 годзе.***

■ Сваімі словамі

# Голад па малой радзіме



**Не ведаю, чаму так склалася, але мы прызвычаіліся не вельмі любіць сябе. Маўляў, няма нічога такога цікавага ў Беларусі — нікуды асабліва не сходзіш, нічога не паглядзіш. Аднак мне, як чалавеку, які даволі часта ездзіць па Беларусі, часам даводзіцца назіраць вельмі цікавыя формы любові да сваёй краіны...**



Надарылася неяк завітаць у адзін даволі аддалены раённы цэнтр з камандзіроўкай-вандроўкай. Сустрэлі мяне вельмі добра, засялілі ў невялічкую каларытную прыбудову — люблю такія месцы, у якіх адчуваецца душа. З аднаго боку відаць, што ўсё даволі проста, — многае рабілася сваімі рукамі, а з іншага акурат прыемна тое, што шмат аб чым паклапаціліся для таго, каб госцю было зручна. У такіх месцах хочацца спыніцца і застацца даўжэй.

Прачнуўшыся даволі рана ў такой прыемнай атмасферы, я сабралася, падсілкавалася і адразу выправілася працаваць. У першай палове дня адбыліся дзве сустрэчы з мясцовымі героямі. Паабедалі мы з краязнаўцай, якая ўсё мне тут распланавала. А пасля пайшлі глядзець горад. Па маіх (нават самых грубых) падліках у 17 гадзін я ўжо дакладна павінна была вызваліцца — вярнуцца ў свой пакойчык, а пасля зноў выбрацца ў горад, па ўласным інтарэсе. Аднак дзе там! Мы хадзілі па розных вуліцах і завулках, доўга стаялі каля вельмі многіх будынкаў. Я пачула пра гэты горад надзвычай шмат, — падавалася, што пра яго я ведаю больш, чым пра родны горад і сталіцу, дзе цяпер жыву, разам узятыя! А экскурсія ўсё працягвалася... Ведаеце, добрага павінна быць таксама ў меру. А 19-й гадзіне я пачала адчуваць, што пара ладзіць уцёкі. Аднак гэта аказалася не так проста: горад даволі заблытаны, і адпускаць мая «гаспадыня» мяне ну ніяк не хацела. У 20 гадзін я, ужо не хаваючы раздражнення, запытвала толькі адно: «у якім баку маё жыллё?», каб самой дабрацца туды. Ды на гэта пытанне праважатая мне... схлусіла. І павяла ў супрацьлеглы бок. Каб паказаць месца, дзе адзін беларускі мастак, праязджаючы тут, стварыў сваю вядомую карціну... Ні слухаць, ні бачыць нічога я ўжо не магла. Калі падман раскрыўся, раззлавалася. Падумала, што лепш сама пайду ў нікуды і буду шукаць патрэбны дом. У 21 гадзіну на вуліцы панавала цемра (было гэта не летам), а мы сядзелі на прыпынку, чакаючы аўтобуса. І толькі бліжэй да дзясятай я нарэшце здолела вярнуцца ў пакойчык...

Гісторыя гэтая не адзінкавая ў маёй працы (што праўда, я добры, зацікаўлены слухач, таму часам суразмоўнікаў, не распешчаных увагай, даводзіцца спыняць). Неяк даводзілася вяртацца з паездкі ў яшчэ адзін раённы цэнтр. Да адпраўлення аўтобуса заставалася 45 хвілін. Ужо іншая мясцовая краязнаўца, якая суправаджала мяне, прапанавала паглядзець на іх славутасць, да якой, быццам бы, рукой падаць! Я пагадзілася... Мы ішлі і ішлі, колькі разоў я прапаноўвала вярнуцца, аднак чула ў адказ, што мы шмат адолелі шляху, а засталося мала... Абутак быў не вельмі зручны, я крыху нацёрла ногі. Як дайшлі да месца, палюбаваліся літаральна хвіліны тры — і пакрочылі назад. Натуральна, на запланаваны транспарт я ўжо не паспела.

Калі раптам героі, апісаныя вышэй, пазнаюць сябе, вельмі б не хацелася, каб яны пакрыўдзіліся. Я прыгадваю гэтыя выпадкі хутчэй з усмешкай і нават з удзячнасцю за тое, што гэта было, — і за тую гасціннасць, з якой мяне сустракалі.

Аднак вось якая напрошваецца выснова. Мы любім сваю малую радзіму, мы шмат ведаем пра яе — і вельмі хочам каму-небудзь расказаць. Пры гэтым любаванне прыгажосцю сваіх гарадоў неяк не закладзена ў нашу культуру. Не надта прынята камусьці паказваць штосьці не вядомае ў межах усяго свету, але пры гэтым вельмі асаблівае і цікавае на мясцовай карце (заўсёды з радасцю дзеляцца ведамі хіба гісторыкі). Ды падсвядома мы адчуваем, што паказаць ёсць што! Ёсць што расказаць і чым ганарыцца.

Мы «галодныя» па сваёй малой радзіме. Мы хочам аддаць ёй даніну павагі, у пэўным сэнсе праславіць, толькі не заўсёды ведаем, як. Адчуваем, што, нягледзячы нават на знешнюю прастату, за ёй хаваецца штосьці вялікае і прыгожае. Гэта як прызнанне ў любові. Якога так не хапае.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

# КУПАЛА, ВЯЗЫНКА, СУСВЕТ

*З зямлёй і небам звязывае мяне ніць —*
*Неразарваная веквечна павуціна...*
*Янка Купала*



**На малой радзіме Янкі Купалы ў вёсцы Вязынка прайшло традыцыйнае свята — з суседніх гарадоў і вёсак сюды прыехалі аматары паэзіі Песняра, каб разам адзначыць дзень яго нараджэння.**















У Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка» такія фэсты паэзіі, песні, народных рамёстваў праводзяцца даўно. У наш час праз гэта месца праходзіць турыстычны маршрут ЮНЕСКА.

Гэтым разам госці Вязынкі сталі ўдзельнікамі цікавай праграмы: са сцэны пад шатамі старых дрэў гучалі вершы Песняра, распovеды пра гісторыю мемарыяльнага запаведніка. Выступленні празаікаў і паэтаў, членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі надалі святу асаблівую паэтычную афарбоўку.

Што датычыцца багацця фарбаў — іх мелася ўдосталь на размешчаных тут выставах, дзе можна было не толькі падзівіцца на творчасць народных майстроў, але і набыць вышываныя ручнікі, пасцілкі, вырабы з лазы, саломкі, малюнкі... Дарэчы, многія ўмельцы праводзілі майстар-класы, ахвотных пераняць сакрэты старажытнага рамяства было вельмі шмат.

Найбольшае ажыўленне панавала перад сталамі з новымі кнігамі беларускіх дзяржаўных і прыватных выдавецтваў. І гэта зразумела: кніга, прывезеная з малой радзімы Песняра, — найлепшы падарунак з такога свята.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

❍ ТЫМ ЧАСАМ

# Купалаўскі вечар у Чэбаксарах

**Сёння ў сталіцы Чувашыі пройдзе літаратурны вечар, прысвечаны дню нараджэння народнага песняра Беларусі Янкі Купалы.**

Сустрэчу паэтаў, перакладчыкаў, чытачоў у Нацыянальнай бібліятэцы Чувашскай Рэспублікі, акрамя саміх гаспадароў, арганізаваў яшчэ і Чувашскі рэспубліканскі фонд імя Міхаіла Сеспеля.

— Не магу не нагадаць, што ў класіка беларускай літаратуры свая ўласная далучанасць з нашымі Чэбаксарамі, з Чувашыяй, — расказвае паэт Валерый Тургай, з якім мы звязаліся па тэлефоне. — Менавіта з публікацый вершаў Купалы на чувашскай мове пачалі фарміравацца беларуска-чувашскія літаратурныя сувязі ў 30-я гады мінулага стагоддзя. На чувашскую мову Купалу перакладалі А. Галкін, Ю. Скварцоў, А. Арцем'еў, Г. Яфімаў, А. Эсхель, Г. Юмарт, М. Юхма і шмат хто яшчэ з нашых літаратараў. Своеасаблівым стымулам да пераўвасаблення паэзіі класіка беларускай літаратуры на чувашскую стала і тое, што на пачатку Вялікай Айчыннай вайны Янка Купала некаторы час жыў у Чэбаксарах. Паэт сябраваў з народнымі паэтамі Чувашыі Мікалаем Шэлепі і Сямёнам Эльгерам.

Будзе што расказаць на вечары Валерыю Тургаю і пра ўласны досвед перакладчыцкага асэнсавання неўміручай паэзіі. Нядаўна чувашскі літаратар завяршыў пераклад «Санетаў» Янкі Купалы. Мяркуецца, што гэты пераклад будзе надрукаваны ў зборніку «Санетаў» Янкі Купалы на мовах народаў свету. Кніга пабачыць свет у мінскім выдавецтве «Мастацкая літаратура».

**Сяргей ШЫЧКО**

Пантэон Айчыны

# «З ЗЫЧЛИВАСТИ КУ МОЕЙ ОТЧИЗНЕ»

## *ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ*

**З далёкага XVI стагоддзя гучыць ягоны заклік да нашага сумлення — заклік патрыёта — прысвяціць сябе Бацькаўшчыне. Ён не здзяйсняў вялікіх спраў, якія заносілі б у хронікі, ён не вяршыў лёсам краін і народаў. Слаўны той, хто са зброяй бароніць родную зямлю ад ворага, і слаўны той, хто свой талент аддае ёй на пажытак і патрэбу. Васіль Цяпінскі быў і рыцарам, і асветнікам. Ён з тых, для каго Айчына — гэта ягонае жыццё, «если она до конца згинет, з нею згинуть».**

Просты шляхціц Васіль Цяпінскі выконваў свой шляхетны абавязак «войну служити». У перапісе войска Вялікага Княства Літоўскага за 1567 год ёсць згадка і пра яго. «Товарыш Василей Тяпин на шесть кони. На нем панцер, шишак, шабля, гаркабуз, кончер, секира, под ним дрыкгант сив». Служыў Цяпінскі афіцэрам у коннай роце аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага. Смелы, мужны воін Кміта-Чарнабыльскі славіўся арыгінальным талентам літаратара і, безумоўна, паўплываў на маладога Цяпінскага.

Увогуле Цяпінскаму пашчасціла на добрае знаёмства. Ведаў ён падканцлера Астафія Валовіча, чалавека высокаадукаванага і разумнага. Сябраваў з мысліцелем Сымонам Будным. Так што нічога дзіўнага не адбылося, калі воін стаў асветнікам, перамяніў шаблю на пяро.

Чуйнае сэрца патрыёта адчувала новую бяду. На Беларусь насоўвалася культурная і духоўная цямрэча. Тыя, хто называўся пастырам народа, не неслі яму святло, не адчынялі «школы ку науце». Многія з паноў і шляхты занядбалі «народе езыка своего славного». Духоўнае здзічэнне люду паспалітага, культурная асіміляцыя вяльможнага панства былі куды небяспечней за варожае нашэсце. І трэба было ратаваць край ад цемры невуцтва, ад здрады роднай культуры і мове. І фронт гэтай барацьбы пралёг праз сэрцы і душы людзей. Тут шабляй не пасячэш.

Знаёмства Васіля Цяпінскага з Сымонам Будным у поўнай ступені прадвырашыла яго жыццёвы шлях. Для вайсковага афіцэра, які агрубеў душой на вайне, філосаф і мысліцель стаў настаўнікам і сябрам. Разам яны заняліся асветай народа. Цяпінскі пераклаў Евангелле на беларускую мову і каля 1570 года выдаў яго ў сваёй друкарні. У прадмове (з нейкіх прычын яна не ўвайшла ў кнігу) Цяпінскі пісаў, што ён «яко сприязливый, простый и щирий, правдиве, верне, а отвористе, з зычливости ку моей отчизне, ...з убогое своее маетности народу моему услутую».

Збіраўся Цяпінскі выдаць і Катэхізіс, які ён напісаў на беларускай мове. Невядома, што перашкодзіла гэтаму. Чаму спыніўся яго друкарскі станок? Пэўна, не хапіла Цяпінскаму «маетнасці». Сам прызнаваўся, што «тяжкие дороги для друку». А ўсё ж ён дзейсна ўдзельнічае ў духоўным жыцці грамадства. Сымон Будны ўспамінаў, што ў 1567 годзе ў «доме брата мілага Васіля Цяпінскага» праходзіў сінод сацыянаў. Пазней, у 1578 годзе, Цяпінскі абараняў на сінодзе ў Лоску погляды Буднага, пра што той і пісаў: «Адазваўся адзін шляхціц, а затым і іншыя, што ўрад мяча не супярэчыць евангельскай навуцы, а таксама як трыманне маёнткаў, удзел у войнах, «прававанне» і г. д. Спрачаліся з ім польскія браты, ды ўжо вечар быў, супакоіліся. Назаўтра пры сваім раз'ехаліся».

Васіль Цяпінскі мог зрабіць шмат «народу своему рускому», ды і зрабіў нямала, але... Гэтае фатальнае але! Колькі светлых памкненняў разбівалася аб гэтае але.

Не кожнаму дадзена стаць вялікім, а вялікае чыняць і простыя людзі, імёны якіх не трапляюць у аналы гісторыі. Просты беларускі шляхціц Васіль Цяпінскі праўдзіва і зычліва слугаваў свайму народу і Айчыне — дзейсніў вялікую справу.

Доўгі час нічога не было вядома пра смерць Васіля Цяпінскага. І вось у 1991 годзе адкрылася адна з таямніц нашай гісторыі. У архівах былі знойдзены дакументы, якія паведамлялі пра смерць Васіля Цяпінскага ад рукі сваіх родзічаў Івана і Васіля Цяпінскіх. Нейкі злавесны сімвал ёсць у гэтай смерці асветніка. Колькі секлі галін і галінак на дрэве беларускай культуры бязлітаснай рукой вырадкаў і чужынцаў? А яно зелянела новымі парасткамі-ганцамі. А заклік Васіля




Цяпінскага народу свайму слугаваць, «языка своего славного» не занядбаць звернуты да нашага сумлення. У роднай мове, у роднай культуры, у духоўнасці бачыў Цяпінскі веліч народа і крыніцу яго духоўнага багацця, «яко то был зацный, славный, острий, довстипный народ их в умеетности и яко многокрот посторонние учоные народы их мудрость мусели похвалять и овшем се от них учить». І свой маленькі дарабак унёс і Васіль Цяпінскі.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

zepter bank

# Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2017 ГОДА

| *В тысячах белорусских рублей* | Примечание | 31 декабря 2017 года | 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 7 | 16 796 | 13 949 |
| Обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь | | 464 | 221 |
| Средства в других банках | 8 | 1 319 | 123 |
| Кредиты, предоставленные клиентам | 9 | 46 132 | 39 821 |
| Ценные бумаги, удерживаемые до погашения | 10 | - | 8 006 |
| Ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи | 10 | 10 616 | 9 427 |
| Основные средства | 11 | 5 252 | 5 545 |
| Инвестиционная недвижимость | 12 | 3 557 | 1 373 |
| Нематериальные активы | 11 | 1 221 | 777 |
| Прочие финансовые активы | 13 | 129 | 127 |
| Прочие активы | 14 | 7 443 | 3 273 |
| **Итого активы** | | **92 929** | **82 642** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства других банков | 15 | 4 | 1 436 |
| Средства клиентов | 16 | 41 492 | 34 705 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 17 | 1 713 | 973 |
| Производные финансовые инструменты, обязательства | 31 | 2 | 2 |
| Прочие финансовые обязательства | 18 | 165 | 97 |
| Отложенное налоговое обязательство | 26 | 317 | 317 |
| Прочие обязательства | 19 | 99 | 202 |
| Субординированные займы | 20 | 15 175 | 14 404 |
| **Итого обязательства** | | **58 967** | **52 136** |
| **КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 21 | 42 208 | 41 298 |
| Непокрытый убыток | | (8 729) | (10 323) |
| Резерв по переоценке основных средств | | 951 | 951 |
| Резерв по переоценке ценных бумаг | 10 | (468) | (1 420) |
| **Итого капитал** | | **33 962** | **30 506** |
| **Итого обязательства и капитал** | | **92 929** | **82 642** |

## ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2017 ГОДА

| *В тысячах белорусских рублей* | Примечание | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | 22 | 7 679 | 10 283 |
| Процентные расходы | 22 | (2 991) | (2 936) |
| **Чистый процентный доход до убытков от обесценения по активам, по которым начисляются проценты** | | **4 688** | **7 347** |
| Изменение резерва под обесценение по кредитам, предоставленным клиентам, по операциям с банками и операциям, не отраженным на балансе | 9,14,18 | (986) | (1 511) |
| **Чистый процентный доход после формирования резерва под обесценение по кредитам, предоставленным клиентам** | | **3 702** | **5 836** |
| Доходы по услугам и комиссии полученные | 23 | 1 423 | 925 |
| Расходы по услугам и комиссии уплаченные | 23 | (234) | (226) |
| Чистая прибыль/(убыток) по операциям с ценными бумагами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | | (9) | 101 |
| Чистый (убыток)/прибыль по операциям с производными финансовыми инструментами | | (18) | (16) |
| Курсовые разницы | | (80) | 1 471 |
| Чистый (убыток)/прибыль от операций с иностранной валютой | | 870 | (534) |
| Административные и прочие операционные расходы | 25 | (7 712) | (7 773) |
| Прочие операционные доходы | 24 | 4 101 | 3 339 |
| Изменение стоимости активов, полученных в погашение задолженности | | (449) | (179) |
| Эффект от первоначального признания кредитов, предоставленных юридическим лицам | | - | (341) |
| **Прибыль до налогообложения** | | **1 594** | **2 603** |
| Расход по налогу на прибыль | 26 | - | - |
| **Прибыль ЗА ГОД** | | **1 594** | **2 603** |

| *В тысячах белорусских рублей* | Примечание | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|
| **Прочий совокупный доход** | | | |
| **Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в прибыли или убытки:** | | | |
| Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи | | | |
| - Чистая прибыль/(убыток) за год | 10 | 952 | (1 420) |
| - Чистая прибыль, перенесенная в прибыль или убыток в результате выбытия | | - | - |
| Переоценка основных средств | 11 | - | 1 268 |
| Налог на прибыль, отраженный напрямую в составе прочего совокупного дохода | 26 | - | (317) |
| **Прочие совокупный доход/(убыток) за год** | | **952** | **(469)** |
| **Итого совокупный ДОХОД за год** | | **2 546** | **2 134** |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2017 ГОДА

| *В тысячах белорусских рублей* | Примечание | Уставный капитал | Непокрытый убыток | Резерв по переоценке основных средств | Резерв по переоценке ценных бумаг | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **На 31 декабря 2015 года** | | **41 298** | **(12 926)** | - | - | **28 372** |
| Прибыль за год | | - | 2 603 | - | - | 2 603 |
| Прочий совокупный (убыток)/доход | | - | - | 951 | (1 420) | (469) |
| Итого совокупный доход за год | | - | 2 603 | 951 | (1 420) | 2 134 |
| **На 31 декабря 2016 года** | | **41 298** | **(10 323)** | **951** | **(1 420)** | **30 506** |
| Выпуск акций | 21 | 910 | - | - | - | 910 |
| Прибыль за год | | - | 1 594 | - | - | 1 594 |
| Прочий совокупный доход | | - | - | - | 952 | 952 |
| Итого совокупный доход за год | | 910 | 1 594 | - | 952 | 3 456 |
| **На 31 декабря 2017 года** | | **42 208** | **(8 729)** | **951** | **(468)** | **33 962** |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2017 ГОДА

| *В тысячах белорусских рублей* | Примечание | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|
| **Движение денежных средств от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 8 144 | 9 567 |
| Проценты уплаченные | | (2 803) | (2 856) |
| Доходы по услугам и комиссии полученные | | 1 406 | 926 |
| Расходы по услугам и комиссии уплаченные | | (234) | (221) |
| Чистая прибыль/(убыток) по операциям с ценными бумагами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | | (9) | 101 |
| Чистый (убыток)/прибыль, полученный по операциям с производными финансовыми инструментами | | (18) | (16) |
| Чистый (убыток)/прибыль, полученный по операциям с иностранной валютой | | 218 | (536) |
| Прочие операционные доходы полученные | | 3 587 | 476 |
| Прочие операционные расходы уплаченные | | (6 836) | (7 793) |
| Налог на прибыль уплаченный | | - | - |
| **Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств** | | **3 455** | **(352)** |
| Чистый (прирост)/снижение по: | | | |
| - обязательным резервам в Национальном банке Республики Беларусь | | (243) | (38) |
| - ценным бумагам, отражаемым по справедливой стоимости через прибыли или убытки | | - | 12 946 |
